Аляксей Якімовіч

# ПАН

*Аповесць і апавяданні*

Мінск
«БЕЛАРУСЬ»
2021

УДК 821.161.3-31/-32
ББК 84(4Беи)-44
Я45

*Выпуск выдання ажыццёўлены па заказе*
*і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

**Якімовіч, А. М.**
Я45 Пан : аповесць і апавяданні / Аляксей Якімовіч. — Мінск : Беларусь, 2021. — 135 с.
ISBN 978-985-01-1405-1.

Героі аповесці, якія прыехалі адпачываць у санаторый, сустракаюцца ў лесе з Панам — міфічным гаспадаром лясоў, палёў і статкаў з казлінымі нагамі, рагамі і барадой. Гэты твор аб каханні, вернасці і здрадзе.

Дэтэктыўныя апавяданні, змешчаныя ў зборніку, вострасюжэтныя, напісаны на маральна-этычныя тэмы, якія хвалююць грамадства.

Для шырокага кола чытачоў.

**УДК 821.161.3-31/-32**
**ББК 84(4Беи)-44**

**ISBN 978-985-01-1405-1**

© Якімовіч А. М., 2021
© Афармленне. РУП «Выдавецтва «Беларусь», 2021

*Дэтэктыўна-містычная аповесць*

# ПАН

## ГАСПАДАР ЛЯСОЎ, ПАЛЁЎ І СТАТКАЎ

Была вясна.

Склаўшы на грудзях рукі, ён сядзеў на лаўцы за блакітным столікам, над якім узвышалася стройная бяроза. А вакол густою сцяною стаяў лес, ціхі, задумлівы, таемны.

Калі б цяпер хто-небудзь раптам убачыў яго, то, напэўна, падумаў бы, што сустрэўся з самім чортам. Але гэта быў не чорт, а Пан — гаспадар лясоў, палёў і статкаў з казлінымі нагамі, рагамі і барадой.

Да Пана данеслася гучная музыка і неразборлівыя людскія галасы.

Пан мацней сціснуў губы. Ён ведаў, што людскія галасы даносяцца з санаторыя, які размясціўся на ўскрайку гэтага лесу. Увесь год у санаторыі збіраецца шмат людзей. Людзі часта прыходзяць і сюды, на палянку, сядзяць за блакітным столікам, бавячы час. А потым адпраўлююцца ў свой утульны цагляны дом, пакінуўшы на палянцы featureзнае смецце.

Лес пазірае на гэтае смецце і шуміць, уздыхае. Скаргу чуе ў яго голасе Пан.

Не раз і не два Пану хацелася падысці да людзей і сказаць ім, каб бераглі лес і паважалі, як паважаюць самае святое на зямлі.

Але Пан так і не падышоў да людзей, не асмеліўся, бо ведаў: гэтыя мірныя людзі заўтра стануць паляўнічымі. Возьмуць у рукі стрэльбы і пачнуць бясконцую пагоню за ім. Ці не самае моцнае пачуццё ў людзей — пачуццё паляўнічага.

А сёння ён сустрэнецца з імі. Надакучыла быць баязліўцам. Пара паказаць сябе. Так сказала і Паненка. Яна папрасіла, каб уступіў у паядынак з людзьмі. А слова Паненкі для яго — закон. Вострым розумам, дзіўнай прыгажосцю, нечуванай ласкай зачаравала Паненка.

Трывожна на душы. Магчыма, самую вялікую ў жыцці памылку робіць ён. Невядома, да чаго можа прывесці гэтая памылка.

Пан узварухнуўся і прамовіў у задуменні:

Ішоў бай па сцяне
У чырвоным жупане.
Дзейнічаць, ці не?

*(З народнага)*

Людзі з санаторыя прыдумалі гульню, у якой будуць называць адзін аднаго мянушкамі. Хто вытрымае такое выпрабаванне, таму аддадуць усе свае залатыя ўпрыгожанні. Учора яны дамаўляліся тут, на палянцы. А ён сядзеў у кустах і слухаў. Так ужо спрадвеку павялося. Ён, Пан, заўжды здалёку назірае за людзьмі. Яны ўжо забыліся, што ён ёсць на свеце, што існуе. Магчыма, таму, што толькі пра сябе думаюць, вельмі любяць сябе. А той, хто вельмі любіць сябе, іншых не заўважае.

— Дзейнічаць, ці не?
— Дзейнічаць.
І ты кажаш — дзейнічаць,
І я кажу — дзейнічаць, —

*(З народнага)*

азірнуўшыся, прашаптаў Пан.

Трэба сустрэцца з людзьмі, трэба правучыць іх як шкоднікаў.

Забаўку знайшлі, мянушкамі адзін аднаго стануць называць!.. Няўжо не ведаюць, што крыўдныя мянушкі балюча раняць і могуць распаліць агонь нянавісці? Такі агонь усё знішчае на сваім шляху, пустыню пакідае пасля сябе.

Пан устаў з-за століка і ў задуменні паглядзеў удалячынь. Чаму ж так адбываецца паміж людзьмі? Можа, ім уласныя імёны надакучылі, як горкая рэдзька? Можа, сталі саромецца і сваіх бацькоў, і роду свайго спрадвечнага?.. Шмат радоў ужо знішчана на зямлі ў бойках, у бітвах, у беспамяцтве, у нянавісці. Згінулі, прапалі, быццам не было іх. А людзі гуляюць, не думаюць пра гэта. Забаўляюцца.Чым крывей, тым смяшней. Не, чым крывей, тым страшней.

Раней цікавей цякло жыццё. Загадкамі, песнямі, казкамі людзі цешылі.

Не перайначыць яму людзей, былога не вернеш. Трэба жыць як набяжыць. Трэба берагчы і лясы, і палі, і статкі…

У глыбіні лесу трывожна азвалася птушка. Пан крыху пастаяў, прыслухоўваючыся, а затым наблізіўся да бярозы. На гладкім белым ствале ён убачыў чырвоную з жаўтаватымі крапінкамі божую кароўку. Яна сядзела нерухома, нібыта незвычайная прыплюснутая прыгожая падкоўка.

— Добрая божая кароўка!.. Цяпло ты адчула, вылезла са шчыліны, на вясеннім сонейку грэешся, — сказаў Пан і асцярожна, двума пальцамі, зняў божае стварэнне са ствала, пасадзіў на далонь і прагаварыў:

Божая кароўка,
Што заўтра будзе —
Дождж ці пагода?
Пень ці калода?
Пагода — ляці.
Дожджык — сядзі!

*(З народнага)*

Божая кароўка нерухома сядзела на далоні. Ёй не хацелася пакідаць цёплую далонь гаспадара лясоў, палёў і статкаў.

— Грэйся, набірайся сілы, жывая кропелька прыроды! — прамовіў Пан і пасадзіў божую кароўку ў высокую шаўкавістую траву.

Дожджык сёння будзе. Божае стварэнне не падмане свайго гаспадара.

Дык што рабіць? Сказаць Паненцы, што не трэба ім уступаць у гэтую небяспечную гульню?

А ці пагодзіцца з ім Паненка? Мабыць, паглядзіць з усмешкаю і ў душы баязліўцам назаве.

Трэба дзейнічаць, каб потым сумленне не мучыла, не грызла, поедам не ела.

— Ішоў бай па сцяне,
Насіў лапці ў кішане.
Ці дзейнічаць, ці не?
— Дзейнічаць, —

прашаптаў Пан. Ён будзе ўдзельнікам гульні, хоць і не ляжыць душа.

У грудзях у Пана зашчымела, быццам нейкі нябачны агеньчык успалыхнуў там. Так здаралася заўжды, калі вельмі хваляваўся.

— Ай ты, Кузьма,
Не вядзі казла,
Вядзі козаньку,
Беланожаньку.
Не вядзі ў асаку,
Бо я ногі пасяку,
А вядзі ў лапушок
Ды купі мне фартушок, —

*(З народнага)*

# ЗМЕСТ

*Дэтэктыўна-містычная аповесць*
ПАН . . . . . . . . . . 3
Гаспадар лясоў, палёў і статкаў . . . . . . . . . . 3
Людзі з санаторыя . . . . . . . . . . 6
Пра каханне . . . . . . . . . . 11
З Панам . . . . . . . . . . 13
Сутычка . . . . . . . . . . 15
Абавязкова выстраліць . . . . . . . . . . 16
У групу падтрымкі . . . . . . . . . . 22
Пятро, Пан... . . . . . . . . . . 23
І Паненка . . . . . . . . . . 24
Падарунак ад Пана . . . . . . . . . . 27
Адчайны крык . . . . . . . . . . 28
Таня . . . . . . . . . . 30
І Вікуля . . . . . . . . . . 30
Дзве катэгорыі . . . . . . . . . . 34
Зацкаваны . . . . . . . . . . 35
Роднае, спрадвечнае . . . . . . . . . . 40
Жаданне Пана . . . . . . . . . . 41
Добрая фея . . . . . . . . . . 44
Наэлектрызаваная атмасфера . . . . . . . . . . 46
«Заплаці за маўчанне» . . . . . . . . . . 51
Як Заблоцкі на мыле . . . . . . . . . . 53
Прапанова . . . . . . . . . . 54
«Навучу, як стаць гейшай» . . . . . . . . . . 57
Здагадка Пятра . . . . . . . . . . 61
З Панам заадно . . . . . . . . . . 61
Дуэль . . . . . . . . . . 64
«Рот на замку трымай» . . . . . . . . . . 68
Маці-камандзірша . . . . . . . . . . 73
Часцінка нашага жыцця . . . . . . . . . . 77

*Дэтэктыўныя апавяданні*
Страх . . . . . . . . . . 84
Крыж МіхалаВаловіча . . . . . . . . . . 97
Лімонка . . . . . . . . . . 108
Дзевяць кропель клафеліну . . . . . . . . . . 118
Пушкін . . . . . . . . . . 126
Кілер . . . . . . . . . . 128
Зграя . . . . . . . . . . 132

Літаратурна-мастацкае выданне

**Якімовіч** Аляксей Мікалаевіч

**ПАН**

*Аповесць і апавяданні*

Рэдактар *Ю. А. Аверчанка*
Мастацкі рэдактар *А. І. Бужынская*
Тэхнічны рэдактар *С. Л. Печанёва*
Карэктар *В. І. Смірнова*

16+

Падпісана да друку 24.01.2021. Фармат 60×90$^1/_{16}$ .
Папера афсетная. Друк афсетны.
Ум. друк. арк. 8,5. Ул.-выд. арк. 7,0. Тыраж 800 экз. Заказ

Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Выдавецтва «Беларусь».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/4 ад 09.07.2013.
Пр. Пераможцаў, 11, 220004, Мінск, Рэспубліка Беларусь.
http://belarusbook.by

Адкрытае акцыянернае таварыства «Друкарня «Перамога».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/38 ад 29.01.2014.
Вул. Таўлая, 11, 222310, Маладзечна, Рэспубліка Беларусь.